# Капялюш для караля

*Калнін, В.В. Капялюш для караля / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 134-155.*

Дробны пыл туманам разлёгся над дарогай. Яшчэ чуваць грукат колаў адбягаючага абозу. Шлейф уздыбленага пылу паступова асядае. Вось праявілася непакрытая галава, ніжэй - апушчаныя плечы самотнай постаці, урэшце відаць і саму дарогу. Вакол запыленых ботаў самотніка сляды завернутых з папярэдняга напрамку колаў.




Дагналі, адабралі і павезлі назад, да Гродна, усё. Ужо не адрозніць у даляглядзе ўкладзеныя па вазах скрыні з асабістымі рэчамі, паперамі, пражэктамі. Тут, на дарозе, палепшанай калісьці па яго загадзе, пакінулі самога аднаго. Куды далей? Ззаду шлях жыцця даўжынёю 47 гадоў, лепшая траціна якога аддадзена ўжо адабранаму ад яго Гродна. Наперадзе шлях даўжынёю 47 міль да яшчэ не адабранага маёнтка ў Паставах, шлях у ганебную адзіноту. Добра яшчэ, што засталася цэлая галава.

Час падзеі - 1780 год. Самотная постаць на дарозе - Антоній Тызенгаўз. Яшчэ ўчора важная персона ў дзяржаве: падскарбі літоўскі, упраўляючы каралеўскімі эканоміямі, гарадзенскі староста. На працягу пятнаццаці гадоў ён меў усё - уладу, казну, падтрымку караля, павагу сярод шляхты, паплечнікаў у здзяйсненні сваіх задумаў.

Мроілася Тызенгаўзу з сядзібы каралеўскіх эканомій у Гродне стварыць новы ўзорны горад, цэнтр прамысловасці, навукі і высокага мастацтва. Тут, на Гарадніцы, ужо паўстала больш за восем дзесяткаў будынкаў, закладзены батанічны сад, адкрыты школы лекараў, будаўнікоў, бухгалтараў, артыстаў, "святочная" школа для вучняў з мануфактур.



Саміх мануфактур налічвалася два дзесяткі. А яшчэ па-за межамі горада, пры рэчцы Ласосне, планавалася размясціць каля трох сотняў пабудоў, пра- весці каналы, стварыць запруды з коламі пад мануфактурныя машыны.

Як водзіцца пры вялікай справе, знайшліся зайздроснікі і шаптуны. Да сапраўднага

ўладальніка эканомій караля Станіслава Аўгуста паляцелі да- носы: з эканомій тавары не прадаюцца, наглядчыкі крадуць, Тызенгаўз нікога не слухае.



Нарэшце неспадзявана кароль з’яўляецца ў Гродне. Тызенгаўза ў горадзе няма. Пачынаецца агляд мануфактур. Манарх пешкі крочыць па Гарадніцы. Світа прыціхла, чакае прысуду. Той усім задаволены. Батанічнаму саду Жылібера надае статус каралеўскага. У карэтнай мануфактуры зіхацяць бліскучым лакам карыолькі, дыліжансы, берлінкі. Першы пакупнік - сам кароль, потым адзін прыдворны, другі. Кошты высокія, але якасць не горшая за англійскія ўзоры.

З наступнай мануфактуры выносяць капялюш на паляванне. Падстаўляюць люстэрка. Наляцеў лёгкі ветрык. Люстэрка на месцы - капелюша няма. Кароль засмучоны: “Не вельмі глыбокі капялюш, дрэнна будзе трымацца на галаве, асабліва пры коннай яздзе”. Нехта са світы бурчыць: “Каб так галава зляцела ў таго, хто гэта прыдумаў”. Але, не зважаючы на заўвагу, манарх узнёслым голасам абвяшчае: “Не ўсё адразу робіцца. Трэба падтрымліваць добрыя пачынанні. Усе купляюць капелюшы, па тры злотых за штуку”.



Аднак карысці ад “трох злотых за штуку” для Тызенгаўза ўжо не было. Пад націскам незадаволенай шляхты кароль пазбавіў яго ўсіх пасадаў. Хутка з’явіліся пераймальнікі ўлады. Тызенгаўз, прыхапіўшы гарадніцкія паперы, спрабуе ўцячы. Абоз дагналі і завярнулі назад. Галаву не зачапілі.

У верхняй частцы горада, на вуліцы Замкавай, ёсць прыгожы будынак, так званы “ампір”. Лічыцца, што ўзнік ён на пачатку 19-га стагоддзя. Аднак гэты будынак мае сваю таямніцу. Яго гісторыя значна ранейшая, бо яшчэ ў 80-я гады 18-га стагоддзя тут будавалі асобны сямейны палац Антонія Тызенгаўза і, паводле архіўных запісаў, “сцены былі ўзведзены ў рост

чалавека”. Пры рэстаўрацыі заўважана: ніжнія часткі сценаў руставаныя, потым русты закладзены і вышэй сцены ўзводзіліся гладкімі. Пачыналі палац у стылі позняга барока, а завяршылі ў ампіры, але ўжо не для Тызенгаўза.

Кім жа быў Тызенгаўз на самай справе? Прадстаўнік Асветніцтва? Невуч? Здольны арганізатар? Няўдалы прадпрымальнік? Мецэнат? Авантурыст? Дагэтуль навукоўцы спрачаюцца, вышукваюць памылкі ў яго дзеяннях, разважаюць пра тое, ці мог ён іх пазбегнуць.

Дзейнасць Тызенгаўза ў Гародні чамусьці нагадвае мне подзвіг Аляксандра Матросава. Гэты сваім целам накрыў амбразуру, каб чырвонаармейцы ўзялі чарговую вышыню. Той паплаціўся сваёй кар’ерай, каб ўратаваць ад заняпаду вялікі горад. Напэўна, Тызенгаўз разумеў, што, уводзячы навацыі, ідзе на вялікую рызыку. Ён разумеў, што памяркоўнымі крокамі тут нічога не зробіш. Перамагчы коснасць і супраціў навацыям можна было толькі дасягненнем гучнай славы. Дзеля гэтага не шкада і вялікіх грошай.

Мэта была дасягнутая амаль праз два стагоддзі, далёка пасля яго смерці.

Пасля ўключэння Гродна ў склад Расійскай імперыі горад над Нёманам становіцца павятовым. Толькі праз пяць гадоў ён набывае статус сталіцы губерні. Немалую ролю ў гэтым адыграла забудова Тызенгаўза. Такіх прадстаўнічых будынкаў, як тут, у Гарадніцы, у прызначаным адразу на цэнтр губерні Слоніме не было. Нездарма ўлада ўтворанай у 1801 годзе Гродзенскай губерні размясцілася ў гарадніцкім палацы Тызенгаўза і па навакольных афіцынах. Улада заставалася тут да канца існавання царскай Расіі.



Колішні батанічны сад, закладзены Жыліберам, пачалі называць Губернатарскім, праз яры перакінуліся мураваныя арачныя масты. Сваімі формамі яны нагадвалі пераправы паміж цяснінамі ў Альпах, адзін з іх меў нават падобную назву - “д’ябальскі”. Так утварылася тут знакамітая “Швейцарская даліна”. Пасля доўгіх гадоў заняпаду яна зараз адноўлена.

Ад часу асядлення тут губернскага праўлення Гарадніца ператварылася з буйнога і рухлівага месца ў элітны, зацішны куток горада. Долам пакручастага рову цячэ невялічкая, але жвавая Гараднічанка. Невысокія далікатныя дамкі вылучаюцца сваёй акуратнасцю на фоне густой зяляніны паркавых дрэў. Пануе пачуццё камернасці, спакою.

Праўда, за два з лішкам стагоддзі ад больш як васьмідзесяці тызенгаўзаўскіх пабудоў засталося толькі восем. Спехам узведзеныя, з разлікам іх замены пасля ўмацавання эканомікі, яны лічыліся часовымі. Акурат як нашы "хрушчоўкі". Але вядома, што няма нічога больш трывалага, як часовае.

Праз пяцьдзесят год пасля Тызенгаўза губернскія пратакалісты выводзілі на паперы: «Стены сіх домов очень тонкія... і не могут удержівать теплоты в комнатах,... построены на одніх деревянных связях, закладенных только в промежутках кірпічем, которыя пріметно, во многіх местах разрушіліcь,... деревянныя прогоны, на которых вся прочность строеній основывается, подверглісь гнілості,... через что оныя строеніі, оставаясь долгое время впусте, угрожают совершенным обрушеніем."

Аднак нашы папярэднікі ўжо адчулі ў Гарадніцы наяўнасць добрай аўры і пастараліся яе захаваць. Старыя дамы пачалі масава "паляпшаць" амаль такім самым спосабам, як зараз рамантуюць "хрушчоўкі" - узводзіць дадатныя ўцяпляльныя сцены знутры. Некаторым дамам такога рамонту хапіла на паўтара стагоддзя далейшага існавання. За "Крывой афіцынай" дагэтуль захаваўся амаль некранутым апошні такі "мастадонт" - двухпавярховы будынак лясной адміністрацыі часоў Тызенгаўза.

Дом з даўніх часоў служыць жыллём. На жаль, яго разбураць, бадай, ужо разбурылі. За прагляд яго можна было браць вялікую плату, дастатковую на ўтрыманне існуючага стану. Такі экспанат задаволіў бы прагных да рамантыкі турыстаў-багемшчыкаў, аператараў-кіношнікаў, пурыстаў-рэстаўратараў: "плач" падцёкаў па абыяк пафарбаваных сценах, цудам "прышпілены" балкончык, латкі з сілікатнай цэглы пад тынкавымі адколінамі, на ніжнім паверсе - ванны салон з асобнай кабінкай для кожнай кватэры - праявы апошніх часоў. Але засталіся натуральнымі, або, як кажуць, аўтэнтычнымі, з 18-га стагоддзя агульнае аблічча, кроквы, бэлькі фахверкавай канструкцыі ("прускага муру"), унутры - лесвіца на моцным слупе, столь на бэльках з класічнымі падрэзкамі і г.д і да т.п.



Вельмі мала засталося ад той Гарадніцы, і тое, што ацалела, усе яшчэ "трымае удар", хоць разбуральных удараў хапала. Першы значны адчуўся пасля пракладкі чыгункі. Старыя, напалову драўляныя дамы саступалі месца мураваным камяніцам.

Уздоўж вуліцы ад вакзала (Ажэшкі) з’явіліся такія гмахі, як пошта (былы шпіталь), жаночая гімназія, Пакроўская царква. Але характар вуліцы і яе повязь з Гарадніцай захаваліся. Болыш за тое, вуліца Ажэшкі і прылеглая да яе мясцовасць сталі для прыезджых у Гродна візітнай карткай горада.

Другі “ўдар” па старым горадзе рыхтаваўся скора пасля заканчэння апошняй вайны, калі залечаны былі першыя балючыя раны разбурэнняў. Згодна з планам рэканструкцыі горада 1963 года ўсе старыя вуліцы цэнтра пашыраліся. “Чырвоныя лініі” праводзіліся проста па камяніцах (на праектным плане лініі сапраўды мелі чырвоны колер). На некаторых вуліцах “абнаўленне” было здзейснена. Гэта добра відаць па той жа вуліцы Ажэшкі з боку вакзала: яна тут шырокая, забудаваная сучаснымі дамамі (акурат у межах “чырвонай лініі”), і толькі далей вяртаецца да натуральных памераў.

Тут варта ўспомніць другую пасля Тызенгаўза асобу, якая спрычынілася да ратавання старога горада. Маецца на ўвазе даследчыца архітэктуры з Масквы Алена Дзмітрыеўна Квітніцкая. Яе продкі паходзілі з Беларусі, і ёй яна прысвяціла большую частку сваёй творчасці. Некалькі важкіх і вялікіх артыкулаў па старой планіроўцы Гродна, Гарадніцы, па асобных помніках горада былі надрукаваны ў 50-я - 70-я гады мінулага стагоддзя ў салідных выданнях і энцыклапедыях Савецкага Саюза. Пасля гэтых публікацый геплан развіцця горада быў перароблены нанова і зацверджаны ў 1973 годзе ўжо з захаваннем гістарычнай забудовы цэнтра. На тле капітальных “чыстак” па іншых буйных гарадах Беларусі Гродна - унікальны прыклад захавання спадчыны.

На гэтым мы завяршаем гістарычную вандроўку па адным з найпрыгажэйшых куточкаў старога Гродна. Пошук таямніц Гарадніцы працягваецца. І хто ведае, можа пры чарговай рэканструкцыі ці рэстаўрацыі старой пабудовы пашэнціць знайсці сарваны лёгкім ветрыкам з манаршай галавы паляўнічы капялюш.